Праект

**80 -БНР**

**Паважаныя грамадзяне Беларусі!**

**25 сакавіка 1998 года спаўняецца 80 год з дня ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтая сапраўды гістарычная дата не ўваходзіць сьвяточным днём у каляндар дзяржаўных сьвятаў, але яе значэньне для лёсу нашай Бацькаўшчыны цяжка пераацаніць.**

**25 сакавіка 1918 г. на пасяджэньні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі было прынята рашэньне абʼявіць незалежнасьць Беларускай дзяржавы. Трэцяя Устаўная Грамата абвяшчала Беларусь незалежнай дзяржавай пасьля больш чым стогадовага перабываньня нашага краю калёніяй Расейскай імпэрыі. Усе навязаныя гвалтам дзяржаўныя сувязі з Расеяй разрываліся. Берасьцейскі мірны дагавор паміж Германіяй і Расіяй ад 3 сакавіка 1918 года быў скасаваны, і тэрыторыя Беларусі абвяшчалася непадзельнай. Ідэя незалежнасьці Беларусі зьдзейсьнілася.**

**Акт 25 сакавіка 1918 году меў сапраўды гістарычнае значэньне. Ён паўплываў і на наступныя падзеі. Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку прызнаў шэраг дзяржаваў. Савецкі ўрад у Маскве таксама вымушаны быў лічыцца з трэцяй Устаўнай Граматай да народу Беларусі. 1 студзеня 1919 г. у Смаленску была абвешчаная Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь — як свайго кшталту адказ на стварэньне БНР. Існаваньне БССР спрыяла росту нацыянальнай самасьвядомасьці, нягледзячы на распачатыя ў 30-я гады жорсткія рэпрэсіі і гвалтоўную русіфікацыю нашай краіны.**

**Далёкім наступствам дзяржаўнага акту 25 сакавіка 1918 году зьявілася прыняцьце Вярхоўным Саветам Беларусі 27 ліпеня 1990 года Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце БССР і наданьне ёй сілы канстытуцыйнага закону 25 жніўня 1991 г.**

**Сёньня ж Беларусь зноў, як і ў 1918 годзе, апынулася пад пагрозай страты незалежнасьці.**

**Сфальсіфікаваўшы вынікі рэфэрэндуму 1996 года, Лукашэнка зьнішчыў Вярхоўны Савет 13 скліканьня як адзіны легітымны орган прадстаўнічай і заканадаўчай улады на Беларусі і ўсталяваў у краіне дыктатарскі рэжым. Гэты акт прававога вандалізму спатрэбіўся яму, каб зьліквідаваць усялякія перашкоды сваім плянам па ліквідацыі Беларусі як самастойнай дзяржавы. У гэтым Лукашэнка фактычна атрымаў падтрымку кіруючага рэжыму Расеі і, у прыватнасьці, Б.Ельцына.**

Утварэньне парляманту «Саюза» Беларусі і Расеі — ёсьць яшчэ адзін палітычны сродак, яшчэ адзін замах на існаваньне Беларусі як самастойнай дзяржавы, бо народ Беларусі не даваў нікому права на разбурэньне сваёй старажытнай дзяржавы. Незалежнасьць і сувэрэнітэт Маці-Беларусі адстойвалі нашы продкі ў шматлікіх крывавых войнах з захопнікамі, у тым ліку і з Маскоўскага княства. Мужныя беларусы баранілі свой Дом-Беларусь ад гітлераўскіх фашыстаў.

Сёньняшняе кіраўніцтва Беларусі не толькі апусьцілася да адкрытага ўсхваленьня ката-Гітлера, але імкнецца стварыць «невиданное миру государство» на основе «православного атеизма» ды «рыночного социализма». Па сутнасьці, наша краіна робіцца разьменнай манетай у гульнях эгаістычных і неўраўнаважаных палітыкаў. Але мы, усе людзі здаровага сэнсу, не павінны дазволіць авантурыстам зьнішчыць выпакутаваную крывёю й потам Беларускую дзяржаву.

Мы заклікаем усіх грамадзян Беларусі адсьвяткаваць 80-ўгодкі утварэння БНР.

Давайце разам

ратаваць і бараніць нашу Бацькаўшчыну-Маці ад духоўных нашчадкаў шалёнага фюрэра, будаваць і ўпрыгожваць наш Дом і наш Храм - Беларусь — на шляху ў адзіную, мірную Еўропу XXI стагодзьдзя!

1. «знішчыць» ВС-13? фанатыкі? пазбаўлены законнага права...
2. шалёны фюрэр?
3. у тым ліку з Маск. княства?